**М. Р. ГАРБАЧЫК**
Брэст, УА “БрДУ імя А. С. Пушкіна”

## АСНОЎНЫЯ ПРЫНЦЫПЫ НАВУЧАННЯ ГРАМАЦЕ ЯК САСТАЎНОЙ ЧАСТКІ КУРСА «БЕЛАРУСКАЯ МОВА»

Навучанне грамаце дзеліцца на тры перыяды: падрыхтоўчы (дабукварны), асноўны (букварны) і заключны (паслябукварны). Спынімся на характарыстыцы асноўных прынцыпаў, найбольш блізкіх камунікатыўна-дзейнаснай канцэпцыі.

Прынцып навуковасці патрабуе, каб змест навучання знаёміў вучняў з аб’ектыўнымі навуковымі фактамі, тэорыямі, законамі, адлюстроўваў сучасны стан навук, якія вызначаюць і асноўны змест вучэбнага прадмета, і арганізацыю самога педагагічнага працэсу.

Прынцып свядомасці і актыўнасці вучняў у навучанні – адзін з галоўных прынцыпаў сучаснай дыдактычнай сістэмы, адпаведна якой навучанне эфектыўнае тады, калі вучні праяўляюць пазнавальную актыўнасць, становяцца суб’ектамі дзейнасці. Гэта выражаецца ў тым, што дзеці ўсведамляюць мэты навучання, плануюць і арганізоўваюць сваю працу, могуць сябе праверыць, праяўляюць зацікаўленасць да ведаў, ставяць праблемы і ўмеюць шукаць іх рашэнне.

Прынцып даступнасці навучання праяўляецца ва ўліку асаблівасцей развіцця вучняў і аналізу дыдактычнага матэрыялу з пункту гледжання іх магчымасцей і арганізацыі навучання, каб дзеці не адчувалі інтэлектуальных, маральных, фізічных перагрузак.

Прынцып нагляднасці, адзін з найважнейшых у дыдактыцы, азначае, што эфектыўнасць навучання залежыць ад мэтазгоднага прыцягнення органаў пачуццяў да ўспрымання і перапрацоўкі вучэбнага матэрыялу. Дэманстрацыя і праца з прадметамі павінны прывесці да чарговай ступені развіцця, стымуляваць пераход ад канкрэтна-вобразнага і наглядна-дзейснага мыслення (эмпірычнага) да абстрактна-лагічнага (тэарэтычнага).

Прынцып сістэматычнасці і паслядоўнасці прадугледжвае навучанне, засваенне ведаў і ўменняў у пэўным парадку, у сістэме.

Прынцып трываласці вынікаў навучання заснаваны на праяўленні пазнавальнай актыўнасці вучняў, а таксама на правільна арганізаваным настаўнікам засваенні новага матэрыялу: дакладнай дазіроўцы дыдактычнага матэрыялу, чаргаванні пры замацаванні ўсіх відаў мыслення і памяці вучня, рэгулярным паўтарэнні пройдзенага, далучэнні новых ведаў у сістэму ўжо наяўных.

Прынцып сувязі навучання з жыццём патрабуе, каб педагагічны працэс стымуляваў вучняў выкарыстоўваць атрыманыя веды ў вырашэнні

практычных задач, аналізаваць і пераўтвараць навакольны свет, выпрацоўваючы ўласныя погляды, светапогляд.

Прынцып рацыянальнага спалучэння калектыўных і індывідуальных формаў і спосабаў вучэбнай працы патрабуе ад настаўніка выкарыстоўваць самыя разнастайныя формы арганізацыі навучання: чаргаванне кампанентаў урока для правядзення вусных і пісьмовых, калектыўных, групавых ці індывідуальных практыкаванняў і інш., а таксама розныя спосабы ўзаемадзеяння вучняў у адукацыйным працэсе: самастойную працу, працу ў пастаянных і зменных парах, у малых і вялікіх групах.

Псіхалагічныя прынцыпы прадстаўлены вядучым прынцыпам развіццёвага навучання, які прадугледжвае, што навучанне падначалена ўсебаковаму развіццю асобы, фарміраванню не толькі ўменняў і ведаў па прадмеце, але і агульнавучэбных дзеянняў, звязаных з рухальнымі і мысліцельнымі аперацыямі, выхаванню пэўных маральных і эстэтычных якасцей. Л. С. Выгоцкі абгрунтаваў законы станаўлення маўлення і мыслення ў працэсе сацыялізацыі, з чаго вывеў прынцып “зоны найбліжэйшага развіцця”, які даказвае неабходнасць максімальнай індывідуалізацыі кожнага вучня [1, с. 94]. П. Я. Гальперын прапанаваў методыку вывучэння вучэбных прадметаў на аснове алгарытмізацыі засваення канкрэтнага дыдактычнага матэрыялу. Л. В. Занкоў увёў прынцып навучання на высокім узроўні цяжкасці, які не супярэчыць прынцыпу даступнасці, г. зн. на тым узроўні, якога вучань можа дасягнуць пад кіраўніцтвам дарослага. Д. Б. Эльконін, В. В. Давыдаў, Л. І. Айдарава і інш. распрацавалі прынцып фарміравання тэарэтычнага мыслення і абгрунтавалі дыдактычную сістэму, якая развівае ў вучня здольнасць засвойваць веды на аснове «даследавання» і самастойна выходзіць на ўзровень абагульнення.

Прынцыпы лінгвістыкі дазваляюць выкарыстоўваць метады моўнага аналізу з мэтай фарміравання маўленча-мысліцельных уменняў. Фанематычны прынцып вызначае, што (якія фанемы) абазначаюць літары, а пазіцыйны прынцып – як перадаюцца фанемы на пісьме. Складовы прынцып чытання і пісьма ў беларускай мове абумоўлены ўзаемаабумоўленасцю значэнняў літары зычнага гука і літары галоснага гука, якая ідзе за зычнай (*маса* і *мяса*). Лексіка-семантычны прынцып прадугледжвае пры вывучэнні канкрэтнай моўнай адзінкі апору на яе лексічнае значэнне, якое вызначаецца толькі пры разглядзе лексемы ў кантэксце другой, больш буйной моўнай адзінкі: гук – у складзе ці ў слове, марфема – у слове ці ў словазлучэнні, слова – у словазлучэнні і сказе, словазлучэнне – у сказе ці ў тэксце. Структурна-семантычны прынцып патрабуе ўлічваць адзінства ўнутранага (змястоўнага) і знешняга (фармальнага) бакоў моўнай адзінкі. Сістэмна-функцыянальны прынцып выкарыстоўваецца для вызначэння стылістычна дакладнага ўжывання той ці іншай моўнай адзінкі.

Да прынцыпаў псіхалінгвістыкі адносяцца камунікатыўна-прагматычны і камунікатыўны. Камунікатыўна-прагматычны прынцып ляжыць у аснове механізмаў маўленчатворчасці, параджэння і ўспрымання маўлення ў адпаведнасці з заканамернасцямі псіхафізіялагічных працэсаў дзіцячага арганізма. Гэта азначае, што лепш за ўсё дзеці засвойваюць нормы мовы практычным спосабам у камунікацыі – спецыяльна арганізаванай гутарцы. Камунікатыўны прынцып прадугледжвае разгляд любога маўленчага ўзаемадзеяння з пункту гледжання тэорыі камунікацыі. Урок – гэта камунікацыя суб'ектаў вучэння і навучання: вучань – настаўнік, вучань – вучань, настаўнік – вучні. Дзейнасны прынцып навучання азначае, што вучань самастойна дзейнічае на ўроку (ці ў другой форме навучання), а настаўнік толькі арганізоўвае ўмовы, працэс навучання, кіруе ім.

Такім чынам, разнастайнасць сучасных метадычных сістэм навучання, якія ў той ці іншай ступені ўлічваюць названыя прынцыпы, дазваляе настаўніку выбраць прадуктыўны падыход для ўласнай дзейнасці.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**

1. Выготский, Л. С. Избранные психологические исследования / Л. С. Выготский. – М., 1965. – 297 с.

**М. Р. ГАРБАЧЫК**
Брэст, УА "БрДУ імя А. С. Пушкіна"

## ТЭАРЭТЫЧНЫЯ АСНОВЫ МЕТОДЫКІ ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАХ

Методыка выкладання беларускай мовы ў пачатковых класах адносіцца да сінтэтычных навук; паняцці "беларуская мова", "выкладанне" і ўласна "методыка" самі па сабе з'яўляюцца навуковымі паняццямі іншых навук – лінгвістыкі, педагогікі, псіхалогіі.

Сучасныя вучоныя-метадысты звязваюць мэты методыкі выкладання беларускай мовы з арганізацыяй дзейнасці двух суб'ектаў педагагічнага працэсу – настаўніка (яго дзейнасць называецца навучаннем) і вучня (яго дзейнасць называецца вучэннем). Таму важнай прынцыповай асновай сучаснай методыкі як навукі з'яўляецца дзейнасны падыход, пры якім педагагічныя працэсы вучэння – навучання разглядаюцца ў першую чаргу як дзейнасць. Дзейнасны падыход, у адрозненне ад многіх іншых псіхолага-педагагічных тэорый, мае зусім канкрэтнае практычнае ўвасабленне – сістэму развіццёвага навучання Д. Б. Эльконіна – В. В. Давыдава.

Ключавой пазіцыяй дзейнаснага падыходу з'яўляецца разуменне сэнсу і сутнасці развіцця. У адрозненне ад прыхільнікаў традыцыйнай